ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (525) | Субота, 8 студзеня 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НА СТАРЦЕ — ЗАЛІКОВА-ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ

З прыходам новага года для студэнтаў наступаюць хвалюючыя і напружаныя дні. Ва ўсіх вучэбных карпусах усталёўваецца дзелавая абстаноўка. Ідзе праверка ведаў, якія набыты студэнтамі за цэлы семестр. Залікі і экзамены поўнасцю адлюструюць ступень падрыхтаванасці будучых спецыялістаў па вывучаемых імі дысцыплінах. Той, хто працаваў сістэматычна, з пачуццём высокай адказнасці за свой студэнцкі абавязак, можа адчуваць сябе спакойна. А вось для тых, хто марна траціў час, садзіўся за падручнікі і канспекты ад выпадку да выпадку, выпрабаванне на заліках і экзаменах будзе нялёгкім і сур'ёзным.

Натуральна, найбольш хвалююцца ў гэтыя дні першакурснікі. Зразумець іх можна: здаюць першыя ў сваім жыцці залікі і экзамены, якія засведчаць, хто на што здольны.

Даўно апраўданымі сталі грамадскія экзамены, якія арганізуюць вучэбна-выхаваўчыя камісіі і саветы выдатнікаў большасці факультэтаў універсітэта для першакурснікаў па найбольш складаных для іх прадметах. Гэта з'яўляецца як бы генеральнай рэпетыцыяй перад сапраўднымі экзаменамі, дазваляе выявіць пэўныя прабелы ў ведах і своечасова ліквідаваць іх. Арганізавана праведзены грамадскія экзамены для першакурснікаў па некаторых дысцыплінах на эканамічным, біялагічным, гісторыка-філалагічным і некаторых іншых факультэтах. Іх карысць стала агульнапрызнанай.

Студэнты універсітэта пачалі ўжо здаваць залікі. Яны — своеасаблівая прыступка да экзаменаў. Першы этап сесіі ўжо прайшлі студэнты чацвёртага і пятага курсаў геалагічнага факультэта. Яны здалі адпаведна па шэсць і сем залікаў. Як паведамілі нам з дэканата геафака, сёлетнія вынікі залікаў значна лепшыя, чым былі летась. Учора чацвёртакурснікі ўжо здавалі першы экзамен, а сёння ён — у пяцікурснікаў.

Зімовая сесія набывае размах і на іншых факультэтах. Задача дэканатаў і кафедр — забяспечыць ёй самы высокі ўзровень. Пачэсны абавязак студэнтаў — парадаваць сваіх экзаменатараў глыбокімі ведамі, актыўна спаборнічаць за тое, каб па паспяховасці забяспечыць сваім акадэмічным групам вядучыя пазіцыі.

## ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

Традыцыйным стала правядзенне на першым курсе нашага факультэта грамадскага экзамена па гісторыі КПСС. Адбыўся ён і ў бягучым навучальным годзе. Сваімі ўражаннямі пра грамадскі экзамен я папрасіў падзяліцца некалькіх студэнтаў. Вось што яны расказалі:

**А. Мужчыніна** (гр. Г-12): Мне экзамен дапамог лепш падрыхтавацца да асноўнага экзамена па гісторыі КПСС, які мы будзем здаваць у зімовую сесію. У ходзе падрыхтоўкі да яго я разабралася з шэрагам няясных пытанняў, упушчаных мною на семінарах.

**М. Мезга:** Дзякуючы грамадскаму экзамену я стаў адчуваць сябе больш упэўнена перад прадстаячай, першай у маім жыцці сесіяй.

**А. Елісеева:** Хочацца адзначыць, што студэнт трэцяга курса Валодзя Біч, які прымаў экзамен, з належнай увагай аднёсся да рабят. Натуральна, усе яны перажывалі, хваляваліся і стараліся як мага лепш адказаць на пастаўленыя пытанні. Я лічу, што грамадскі экзамен важны і патрэбны для нас, першакурснікаў, якія ўпершыню сустракаюцца з такой формай работы.

**П. Галаўко:** Я лічу, што мерапрыемствы падобнага тыпу — важны метад кантролю камсамольскай арганізацыяй працэса вывучэння грамадскіх дысцыплін першакурснікамі.

Падводзячы вынікі грамадскага экзамена, член экзаменацыйнай камісіі Уладзімір Біч сказаў: «У асноўным усе рабяты нядрэнна падрыхтаваліся, хаця ў адказах асобных першакурснікаў не хапала ўпэўненасці і дакладнага аналізу. Але мэта грамадскага экзамена заключаецца не толькі ў тым, каб праверыць веды студэнтаў, а і падказаць ім, як трэба падыходзіць да асвятлення тых ці іншых пытанняў. Я ўпэўнен, што экзамен стаў добрым урокам для першакурснікаў і аблегчыць падрыхтоўку да сесіі».

Адным словам, усе аднадушны ў тым, што грамадскія экзамены вельмі патрэбныя і важныя для першакурснікаў. Пры кантрольнай праверцы выдатныя веды па гісторыі КПСС паказалі Ю. Аляксейчанка, І. Пракопчык, М. Мезга, Е. Дулуб, В. Міхедзька і інш.

У ходзе правядзення экзамена па гісторыі КПСС першакурснікі выказалі прапанову, каб грамадска-палітычныя экзамены наладжваліся на ўсіх курсах. Гэта дазволіць выявіць узровень ведаў камсамольцаў аб сучасным свеце, іх палітычны кругагляд.

У заключэнне хочацца пажадаць першакурснікам паспяхова здаць першую ў іх студэнцкім жыцці залікова-экзаменацыйную сесію.

**В. ЛЮТЫНСКІ,**
**студэнт гр. Г-31 гісторыка-філалагічнага факультэта, член савета выдатнікаў.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра тэарэтычнай фізікі горача віншуюць асістэнтаў гэтай кафедры Валерыя Мікалаевіча КАПШАЯ і Аляксандра Дзмітравіча ЛІНКЕВІЧА, якім за цыкл работ па тэарэтычнай фізіцы прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Гомельшчыны за юбілейны 1982 год.**

## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні ў сераду адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта. Першым на парадку стаяла пытанне «Аб стане і мерах па далейшаму паляпшэнню нагляднай агітацыі». Заслуханы інфармацыі сакратароў і некаторых членаў партыйных бюро аб рабоце, якая праводзіцца на факультэтах па якаснаму паляпшэнню нагляднай агітацыі ў вучэбных карпусах і інтэрнатах. З абагульняючым паведамленнем выступіў адказны ад парткома за насценны друк і наглядную агітацыю рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» У. П. Балога.

Стан наяўнай ва універсітэце нагляднай агітацыі яшчэ далёка не адпавядае высокім патрабаванням часу. Таму адбылася шырокая і прынцыповая размова аб неадкладным яе паляпшэнні. Наконт гэтага сваімі думкамі падзяліліся сакратар парткома М. І. Старавойтаў, рэктар Б. В. Бокуць, намеснікі сакратара парткома У. М. Калмыкоў, Я. А. Семянчук, члены парткома І. Ф. Харламаў, В. І. Сіськоў, прарэктар па АГЧ У. А. Шаўчэнка.

Затым было заслухана і абмеркавана паведамленне члена парткома І. Ф. Харламава аб ходзе выканання пастаноў партыйнага камітэта «Аб рабоце куратараў матэматычнага і біялагічнага факультэтаў па актывізацыі вучэбнай работы і ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў» і «Аб рабоце партыйнага бюро геалагічнага факультэта і дэканата гісторыка-філалагічнага факультэта па кіраўніцтву планаваннем і ажыццяўленню кантролю за выхаваўчай дзейнасцю куратараў студэнцкіх груп».

Па абодвух пытаннях былі прыняты адпаведныя пастановы.

## УСЕ РЭЗЕРВЫ — У ДЗЕЯННЕ

### ДА ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА 1982 ГОД

У год слаўнага 60-гадовага юбілею ўтварэння СССР калектыў нашага універсітэта дасягнуў пэўных поспехаў у выкананні планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў. Вялікая ўвага ўдзялялася выкарыстанню навейшых дасягненняў у справе навучання і выхавання студэнтаў. На матэматычным і фізічным факультэтах праведзена эксперыментальная работа па актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў, адобраная Мінвузам БССР. Працягвалі актыўна працаваць філіялы кафедр на прадпрыемствах і пры навукова-даследчых інстытутах АН БССР. Вялікую дапамогу ў арганізацыі вытворчай практыкі аказвалі створаныя вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні. Універсітэт выканаў планавае заданне выпуску спецыялістаў.

Летась важнае значэнне надавалася падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў. 90 чалавек прайшлі стажыроўку і перападрыхтоўку ў інстытутах і на факультэтах павышэння кваліфікацыі. Абаронены 1 доктарская і 15 кандыдацкіх дысертацый. Аспірантка Н. Я. Цітова (навуковы кіраўнік — прафесар М. В. Навучыцель) абараніла дысертацыю датэрмінова, а 10 аспірантаў закончылі аспірантуру з прадстаўленнем дысертацый.

Павялічылася колькасць публікацый. Супрацоўнікамі універсітэта за мінулы год выдадзена 2 навуковыя зборнікі, 9 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. У міжнародных выданнях апублікавана 28 артыкулаў, на міжнародных канферэнцыях зроблена 7 навуковых дакладаў. Ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх выданнях апублікавана 300 артыкулаў. Выйшлі ў друку тэзісы 356 зробленых на канферэнцыях дакладаў.

За праграму сістэмы дыспетчара калектыўнага карыстання, распрацаваную лабараторыяй сістэмнага праграмавання (навуковы кіраўнік І. В. Максімей) універсітэт узнагароджаны дыпломам Дзяржаўнага камітэта СССР па навуцы і тэхніцы і ВЦСПС. За распрацоўку комплекса апаратуры, у якой удзельнічалі загадчык кафедры ТСАЭІ дацэнт А. І. Іванюк і дацэнт гэтай кафедры У. С. Давыдаў, камітэт ВДНГ узнагародзіў іх адпаведна сярэбраным і бронзавым медалямі.

Узрос узровень студэнцкай навуковай работы. Колькасць дыпломных прац, рэкамендаваных да ўкаранення, склала 27,1 працэнта — амаль удвая больш, чым у папярэднім годзе. Сем студэнцкіх даследаванняў з эканамічнага факультэта ўкаранёны ў вытворчасць з агульным эканамічным эфектам 13,4 тыс. руб. 92 студэнцкія работы апублікаваны. Дзве студэнцкія навуковыя працы эканамічнага факультэта адзначаны дыпломамі Мінвуза СССР і ЦК ВЛКСМ.

Некалькі палепшылася патэнтна-ліцэнзійная работа. Атрымана 13 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы — на 4 больш, чым у 1981 годзе. Адно з гэтых вынаходніцтваў знайшло прымяненне ў народнай гаспадарцы.

У мінулым годзе выконваліся 82 навукова-даследчыя работы (50 дзяржбюджэтных і 32 гаспдагаворныя), у тым ліку 64 — па важнейшай тэматыцы і амаль адна трэць — па комплексных праграмах. Агульны аб'ём навукова-даследчых работ па універсітэту склаў за мінулы год 1.440 тыс. руб. У прамысловасць укаранёна 26 навуковых распрацовак. Аднак істотным недахопам з'яўляецца яшчэ нізкая эфектыўнасць НДР. Калі ў 1981 годзе эканамічны эфект ад яе складаў 2.897,5 тыс. руб., дык летась знізіўся больш як удвая. Планавы паказчык па эканамічнаму эфекту навуковых распрацовак выкананы толькі матэматычным факультэтам. Найбольшая недастача па эканамічнаму эфекту прыпадае на фізічны і эканамічны факультэты. Іх вучоным трэба больш настойліва ўкараняць вынікі праведзеных даследаванняў у практыку.

Нягледзячы на тое, што адміністрацыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі пастаянна клапаціліся аб умацаванні працоўнай і вытворчай дысцыпліны, захаванні норм грамадскага парадку, на жаль, рэзка ўзрасла колькасць іх парушальнікаў як супрацоўнікамі, так і студэнтамі. Асабліва «вызначыліся» у гэтым пытанні факультэт фізвыхавання, геалагічны і эканамічны факультэты. Прафсаюзнай арганізацыі універсітэта неабходна дамагацца папярэджання ўсіх адмоўных праяўленняў, якія плямяць гонар універсітэцкага калектыву.

Нельга мірыцца і з тым, што гісторыка-філалагічны, біялагічны, эканамічны, геалагічны факультэты і факультэт фізвыхавання ігнаруюць рашэнне Савета універсітэта, рэктарата, парткома і прафкома, не ўкараняюць у практыку станоўчы вопыт па актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў. Дэканатам названых факультэтаў, старшыням вучэбна-метадычных камісій, загадчыкам кафедр неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на ўсямернае прымяненне гэтага вопыту, улічваючы тое, што ў нашым універсітэце будзе праведзена рэспубліканская нарада прарэктараў ВНУ па вучэбнай рабоце з мэтай яго вывучэння.

Падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі і кафедрамі за 1982 год праводзілася ў адпаведнасці з палажэннем, якое некалькі адрознівалася ад раней дзейнічаючых. Гэта адрозненне заключалася ў выкарыстанні кантрольных планавых паказчыкаў, у змяненні формул для падліку балаў, у карэктыроўцы вагавых паказчыкаў асобных відаў работ і ў прымяненні штрафных санкцый за парушэнне тэхнікі бяспекі, правіл працоўнай дысцыпліны і норм паводзін у грамадстве.

За кантрольныя планавыя выходныя браліся асноўныя паказчыкі ўмоў Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва калектываў ВНУ сістэмы Мінвуза СССР, а таксама паказчыкі, якія вызначаюць рост якаснага ўзроўню работы універсітэта. Да іх адносяцца эканамічная эфектыўнасць НДР, укараненне атрыманых вынікаў у вытворчасць, аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, абарона доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, водзывы з месца работы выпускнікоў аб стажыроўцы, дыпломныя работы, рэкамендаваныя ДЭК да ўкаранення і інш. Усяго было выкарыстана 37 планавых паказчыкаў.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі прыводзяцца ў табліцы.

Фізічны факультэт, які заняў першае месца, дасягнуў лепшых паказчыкаў у падрыхтоўцы кадраў і павышэнні іх кваліфікацыі, мае другія вынікі па навуковай і вучэбна-метадычнай рабоце.

Практычна захаваў свае пазіцыі ў сацыялістычным спаборніцтве гісторыка-філалагічны, матэматычны і біялагічны факультэты. У іх рабоце засталіся тыя ж самыя як моцныя, так і слабыя бакі. Праўда, матэматычны факультэт некалькі палепшыў свае паказчыкі па вучэбна-метадычнай рабоце.

З сёмага на пятае месца ў спаборніцтве ўзняўся эканамічн-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# ПАЧУЦЦІ СЯМ'І АДЗІНАЙ

У юбілей 60-годдзя СССР савецкія людзі з асаблівай увагай вывучаюць гісторыю народаў і нацыянальнасцей нашай краіны, з цікавасцю чытаюць творы шматнацыянальнай літаратуры. Сведчаннем гэтага з'явілася і канферэнцыя «У сузор'і роўных», праведзеная на матэматычным факультэце. Яе падрыхтавалі выкладчыкі кафедры матэматычнага аналізу С. І. Буракоўская, А. П. Макарава і супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі.

Ва ўступным дакладзе кандыдат філалагічных навук выкладчык кафедры беларускай літаратуры І. Ф. Штэйнер расказаў аб шляхах развіцця літаратуры народаў СССР, яе здабытках, аб сувязях літаратур нацыянальных рэспублік.

Студэнты факультэта ў сваіх выступленнях гаварылі, як адлюстроўваюцца гісторыя, жыццё розных народаў СССР, агульначалавечыя праблемы ў творах пісьменнікаў савецкіх рэспублік — лаўрэатаў Ленінскай прэміі.

А. Базылёва расказала пра апошні раман кіргізскага празаіка Ч. Айтматава «Завейны паўстанак», дзе матывы кіргізскага фальклору зліліся з думкай аб усім чалавецтве, успаміны пра мінулае з пытаннямі сучаснасці і будучыні.

Тэме Вялікай Айчыннай вайны ў літаратуры народаў СССР прысвяцілі свае даклады студэнткі А. Андрэева і І. Капытка. Вершы з «Маабіцкага сшытка» татарскага паэта Мусы Джаліля прачытала А. Барабанава.

Кожная літаратура носіць свой нацыянальны каларыт. Аб беларускім вобразе жыцця, аб беларускіх характарах асабліва тонка і даклад-на апавядаецца ў палескай хроніцы Івана Мележа. Аб гэтым пераканаўча гаварыла на канферэнцыі І. Іванцова. На роднай беларускай мове прагучалі вершы народных паэтаў Беларусі М. Танка і П. Броўкі, якія выдатна чытала Г. Рудзянок.

У канцы канферэнцыі прысутныя зноў звярнуліся да рамана Ч. Айтматава «Завейны паўстанак», каб на прыкладзе гэтага твора пераканацца, што пісьменнікаў СССР хвалююць лёс і шчасце не толькі людзей сваёй краіны, але і ўсяго свету.

**Н. КАПШАЙ,**
**супрацоўніца універсітэцкай бібліятэкі.**

# АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ,

які прысвячаўся 60-годдзю ўтварэння СССР, прайшоў на геалагічным факультэце.

З лекцыяй «Утварэнне СССР — трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі» выступіў перад студэнтамі факультэта кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі А. А. Рубан.

«Сацыялістычны лад жыцця — вялікі набытак савецкіх народаў» — тэма выступлення доктара філасофскіх навук, прафесара, загадчыка кафедры філасофіі У. М. Калмыкова.

Кандыдат філалагічных навук, асістэнт кафедры беларускай літаратуры І. Ф. Штэйнер прачытаў лекцыю «Дружба народаў — дружба літаратур».

**Т. ГАРАНІНА,**
**намеснік сакратара партбюро па ідэалагічнай рабоце геафака, дацэнт кафедры філасофіі.**

# КУЛЬТПАХОДЫ СТУДЭНТАЎ

43-ці тэатральны сезон Гомельскага рускага драматычнага тэатра адкрыўся ў аднаўленым яго памяшканні. Паказаныя тут спектаклі паглядзела звыш 700 студэнтаў. Каля 400 чалавек было на прадстаўленнях у Гомельскім дзяржаўным цырку.

Культпаходы студэнтаў арганізаваў іх прафсаюзны камітэт.

# ПІЯНЕР ГОМЕЛЬСКАЙ АЛГЕБРАІЧНАЙ ШКОЛЫ

## Да 50-годдзя з дня нараджэння дацэнта С. А. Русакова



САВЕЦКАЯ навуковая школа тэорыі канечных груп была створана выдатным вучоным Героем Савецкага Саюза акадэмікам Отта Юльевічам Шмідтам. Ураджэнец Беларусі, ён у сярэдзіне 50-ых гадоў прапанаваў аднаму з першых сваіх вучняў С. А. Чуніхіну прыехаць у Гомель у адкрываемы інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту з тым, каб развіваць у Беларусі даследаванні па тэорыі канечных груп.

У ліку першых гомельскіх вучняў С. А. Чуніхіна і быў Сцяпан Афанасьевіч Русакоў. А калі ў пачатку 1960 года пад кіраўніцтвам С. А. Чуніхіна ў Гомелі было створана аддзяленне Інстытута матэматыкі АН БССР, С. А. Русакоў стаў адным з першых яго навуковых супрацоўнікаў.

Нарадзіўся С. А. Русакоў у вёсцы Дубовы Лог Добрушскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Навазыбкаўскім педінстытуце (цяпер ордэна Знак Пашаны Бранскі педінстытут імя акадэміка І. Г. Пятроўскага). Рашэннем Савета гэтага інстытута Сцяпан Афанасьевіч быў рэкамендаваны ў аспірантуру.

У 1962 годзе Вучоны савет Матэматычнага інстытута імя В. А. Сцяклова АН СССР прысудзіў С. А. Русакову вучоную ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук. Далёка не кожнаму матэматыку выпадае шчасце абараняць дысертацыю ў цэнтры матэматычнай навукі нашай краіны.

Адзін з выдатнейшых савецкіх матэматыкаў, цяпер член-карэспандэнт АН СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР А. І. Кастрыкін адзначаў тады, што С. А. Русакоў атрымаў шэраг тонкіх і цікавых вынікаў, якія маюць перспектыву развіцця. Сапраўды, адна з даказаных ім тэарэм і сёння з'яўляецца гордасцю усіх гомельскіх алгебраістаў і шырока выкарыстоўваецца многімі матэматыкамі. Каля сарака навуковых работ С. А. Русакова апублікаваны ў цэнтральных матэматычных часопісах, у тым ліку і ў «Докладах Академии Наук СССР». Ён быў членам аргкамітэта дзвюх Усесаюзных алгебраічных канферэнцый, якія праводзіліся ў Гомелі ў 1968 і 1975 гадах.

У пачатку 70-ых гадоў С. А. Русакоў пачаў распрацоўваць новы навуковы напрамак у тэорыі груп. Ім створана арыфметычная тэорыя паліадычных груп, адкрыты невырашальныя паліадычныя групы біпрымарнага і няцотнага парадкаў. Атрыманыя ім у апошнія гады вынікі знайшлі шырокі водгук у асяродзі матэматыкаў-алгебраістаў як у нашай краіне, так і за рубяжом, што адлюстравалася, у прыватнасці, у нядаўнім запрашэнні С. А. Русакова на Міжнародны сімпозіум у Югаславію.

«Вынікі даследаванняў С. А. Русакова прадстаўляюць істотную навуковую цікавасць, а яго праблематыка, звязаная з вывучэннем «энарных» груп, з'яўляецца перспектыўнай»,— так адгукнуўся аб навуковай дзейнасці С. А. Русакова вядомы савецкі вучоны ў галіне тэорыі груп член-карэспандэнт АН Украінскай ССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР С. Н. Чэрнікаў.

Ні адна падзея ў жыцці калектыву Гомельскага аддзялення ІМ АН БССР, ні адно грамадскае мерапрыемства не праходзіць без актыўнага ўдзелу С. А. Русакова. Яго заўсёды можна бачыць у акружэнні аспірантаў з крэйдай ля дошкі або за рабочым сталом. У Сцяпана Афанасьевіча ёсць і свае вучні. Ён ужо шмат гадоў сумяшчае сваю навуковую дзейнасць з педагагічнай працай на кафедры алгебры і геаметрыі ГДУ, з'яўляецца актыўным супрацоўнікам філіяла гэтай кафедры пры Гомельскім аддзяленні Інстытута матэматыкі АН БССР. Яго лекцыі цікавыя тым, што ў іх акадэмічная строгасць умела спалучаецца з даступнасцю і яснасцю выкладання.

С. А. Русакоў неаднаразова выбіраўся старшынёй прафсаюзнага камітэта аддзялення ІМ АН БССР, з'яўляўся членам аблсаўпрофа, быў дэлегатам XIV з'езда прафсаюзаў Беларусі. Ён узнагароджаны юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», многімі граматамі, з'яўляецца пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва.

Сваё пяцідзесяцігоддзе Сцяпан Афанасьевіч сустракае ў росквіце творчых сіл, і мы ад усёй душы жадаем яму вялікага асабістага шчасця, далейшых плённых поспехаў у працы на карысць нашай сацыялістычнай Радзімы.

**С. ЧУНІХІН,**
**кіраўнік Гомельскага аддзялення ІМ АН БССР, акадэмік АН БССР, заслужаны дзеяч навукі БССР.**
**Л. ШАМЯТКОЎ,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце ГДУ, член-карэспандэнт АН БССР.**
**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**сакратар партбюро матфака.**

формулы-сцвярджэнні набываюць не толькі індывідуальныя адценні, але і пераканаўчасць.

Спасцігаючы свет (характэрная ў гэтым плане сама назва першага раздзела — «Спасціжэнне»), аўтар альбо яго лірычны герой (што часта — адно і тое ж) не толькі выяўляе свой асабісты вопыт, спасылаючыся на акалічнасці і падрабязнасці ўласнай біяграфіі, але і звяртаецца да гістарычнай памяці ўсяго народа, адлюстроўваючы найбольш яскравыя старонкі гераічнага летапісу краіны. Паказальнымі ў гэтых адносінах могуць быць вершы «Апошні абаронца Брэсцкай крэпасці», «Балада пяцярых», «Гагарынскі сон», «Доўга з рук мы...».

Сапраўднай удачай паэта, творам, які, на маю думку, узбагаціў сучасную беларускую лірыку, можна лічыць верш «Замошская рота», — суровы рэквіем змагарам-землякам, што аддалі сваё жыццё за свабоду Айчыны:

**Не трэба слязы ні**
**адкрытай, ні ўпотай,**
**Ні родных, ні блізкіх.**
**За вёскай Замошша**
**сабралася рота**
**Пад абеліскам.**
**Часцей, чым вадою,**
**іх умывала**
**Крывёю і потам.**
**Імёны, імёны на вечным**
**прывале —**
**Іх цэлая рота.**
**Пілоты тут ёсць,**
**партызаны, танкісты,**
**А большасць — пяхота.**
**Сыны-камсамольцы,**
**бацькі-камуністы —**
**Зводная рота.**
**Нідзе каб зямля аніколі**
**не знала**
**Ні ўдоў, ні сіротаў,**
**За гэта Замошша**
**калісьці паклала**
**Адборную роту.**
**Паслухайце долы**
**з вятрамі ў журботе, —**
**Ці спёка, ці слота.**
**Вы чуеце, людзі, —**
**пайшла ў бессмяротце**
**Замошская рота.**

Зварот паэта да гістарычных падзей, да вобразаў выдатных людзей заканамерны, але не заўсёды паспяховы. Нялёгка сказаць нешта новае і сказаць непаўторна, па-свойму, пра тое, што ў літаратуры і мастацтве мае класічныя ўзоры вырашэння. Таму, калі падыходзіць з самымі высокімі крытэрыямі да вершаў Паўлава, то асобныя з іх, прысвечаныя вобразу У. І. Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі («Дзень Кастрычніка», «З глыбінь вякоў, нібыта з сутарэння...») не пераадолелі бар'ера пэўнай прамалінейнасці, агульнавядомай інфармацыйнасці. Як правіла, для такіх вершаў уласціва адсутнасць вобразнага мыслення, яны грашаць не заўсёды апраўданай дэкларацыйнасцю, агульнасцю.

Неабходна адзначыць вершы-мініяцюры, якія нярэдка складаюцца з аднаго чатырохрадкоўя. У сваёй большасці яны насычаны свежай думкай, вобразнай маляўнічасцю, змястоўнасцю і трапнасцю назіранняў. Да ліку такіх адносяцца: «Гады», «На палях закусцілася жыта...», «Параўнанне», «Спасціжэнне», «Зялёным бляскам слепіць ціна...», «Бывае, час наперад забяжыць...». Слабейшымі атрымаліся мініяцюры «Просьба сэрцаеда» і «Нямала хто шукае печы...». У апошняй, між іншым, некалькі прыцемнены сэнс першага радка, невыразны характар яго скіраванасці. Усё зразумела, калі гаворка ідзе аб тым, што нехта «ў небе ловіць жураўля», а вось што за печы шукае нехта, якія гэта печы? Неяк яны тут не стасуюцца...

Кніга «Сляза на вейцы» выглядае разнастайнай як у кампазіцыйных і стылёва-вобразных, так і ў тэматычных адносінах. Нямала вершаў прысвечана жаночай прыгажосці і дабрыні, пяшчоце юных далоняў і таленту маладой душы, «якой ад сонца запаліць агонь». Лірычны герой паказаны не толькі ў стане радаснай узрушанасці, але і ў хвіліны смутку, роздуму над незваротным, над тым, што, магчыма, страчана назаўжды як самае дарагое, незаменнае («Росная сцежка. Луг не-шырокі...»).

Любоў, як бясцэнны дар, не выступае ў Паўлава ні ў абстрактнай сімволіцы, ні ў рытарычна - шаблонных іпастасях. Яна — зямная, рэальная, як і той свет, у якім жывуць героі паэта; яна — метафарычная ў адлюстраванні, хоць аўтарскія радкі не вылучаюцца знарочыстакідкай асацыятыўнасцю, вобразнай нечаканасцю. Часам усёй метафара-вобразам выступае верш ў цэлым, не «абцяжараны» складанай вобразнасцю. У ліку такіх твораў — «Дзяўчаты», «Элегія», «Жаночая любоў».

Апавядальная манера пісьма У. Паўлава добра выявілася ў такіх ягоных вершах, як «Юра Кіле», «Хвіліна маўчання на гары Славен», «Суседу ў вёсцы», «Хмель баравы». Гэтым, як і іншым творам, уласцівы натуральнасць голасу аўтара, праўдзівасць паводзін і жэстаў яго герояў.

Адным з цэнтральных з'яўляецца, безумоўна, верш «Сляза на вейцы», які і даў назву зборніку. Гэты верш — як сімвал трывожнага веку, дзе неспакойна цэлай планеце. У ім ідзе размова і аб ўсёй Зямлі, якая становіцца своеасаблівай слязой на вейцы бязмежнага Сусвету, і аб слязе чалавека, які павінен быць шчаслівым. Увагай да людскога лёсу, да штодзённасці, у якой чалавек далучаны да радасці і да болю іншых, прасякнуты радкі гэтага твора:

**Свае трывогі, людское**
**шчасце**
**Цаніць умейце.**
**Яшчэ не позна,**
**не дайце упасці**
**Слязе на вейцы.**

Святлом любві да роднай зямлі, да яе людзей сагрэты радкі лепшых твораў новага зборніка У. Паўлава. Ён і сам добра ўсведамляе, што кожная новая кніга — гэта не проста механічны крок наперад, а нялёгкае пераадоленне сябе, пераадоленне той звычайнасці і супраціўлення матэрыялу, з якіх і трэба выкрасаць агонь паэзіі.

**Віктар ЯРАЦ.**

